**Мацiеўскi, М.** З такім абавязкова пераадолеем / М. Мацiеўскi // Сцяг Ільіча (Талачын). – 2000. – 4 кастр. – С. 1.

## З ТАКІМ АБАВЯЗКОВА ПЕРААДОЛЕЕМ

Сяргей Лугоўскі  яшчэ малады гадамі, але, нягледзячы на гэта, у сваім жыцці ен зведаў вельмі многае. І самым суровым выпрабаваннем для яго была вайна ў Афганістане, дзе ен выконваў інтэрнацыянальны абавязак. Будучы карэкціроўшчыкам агню, не кланяўся варожым кулям, снарадам, праявіў сапраўдны мужчынскі характар, мужнасць і адвагу, аб чым сведчаць баявыя ўзнагароды. Але сення наш расказ пра Сяргея Лугоўскага як мірнага хлебероба.

Сяргей – чалавек сур’езны, разважлівы ў размове, але, калі пачуе дасціпны жарт, усміхаецца вельмі ужо прывабнай усмешкай. І тады нізашто не паверыш, што бярэ ён на свае плечы такую нагрузку, якая не пад сілу многім.

Вось што ён гаворыць наконт гэтага:

– Бывала, гляджу, як з краю ў край хвалюецца ніва, як нізка хіляцца долу, бы кланяючыся, каласы, – і сэрца гатова пець, а ў душы – светлая радасць. Гэта ж дзякуючы табе, тваім клопатам нарадзіла зямля такое багацце. А якая радасць глядзець на залаты струмень, што б'е з выгрузнога шнэка камбайна ў час жніва! Не ведаю большага шчасця, чым вырошчваць хлеб. Асабліва востра я пачаў адчуваць гэта пасля афганскай вайны...

Сяргей змаўкае, напэўна, узрушаны высокімі словамі аб сваім хлебаробскім прызванні, словамі, якія яму, як і кожнаму працаўніку зямлі, рэдка даводзіцца гаварыць. Гэта быў, пэўна, такі ўрачысты момант, калі працаўнік поля як бы адарваўся на імгненне ад сваіх спрадвечных хлебаробскіх клопатаў, глянуўшы на сябе як бы з боку, нават крыху з вышыні, і здзівіўся свайму высокаму прызначэнню на зямлі.

– Мне вельмі падабаец-ца, як працуе Сяргей, – зазначае старшыня СКП «Беларусь» Ігар Васільевіч Фаміноў. – Адчуваецца, што хлебаробскія клопаты дарагія яго сэрцу. Таму і атрымліваецца ў яго больш і лепш, чым у іншых механізатараў. Абавязкова напішыце пра Сяргея. Тэты хлопец у любой справе не падвядзе. Ен і араты, і сейбіт, і камбайнер, якіх пашукаць трэба. Ледзь толькі зоймецца досвітак, а ён ужо на машынным двары. Словам, сапраўдны гаспадар

І гэта так. Тэхніку Сяргей Лугоўскі любіць неикай невыказнай любоўю. І гэта непраходзячая любоў на ўсё жыццё.

Няма ў Сяргея пакуль што званняў і ўзнагарод. Але яму давяраюць, на яго спадзяюцца, ускладаюць надзеі.

– Працуе за траіх, – гаварылі пра механізатара і яго калегі, і ў канторы. – Ні ад якой работы не адмаўляецца, усё яму па плячы. Рэдка каму дае сябе абагнаць.

Кароткая характарыстыка. А можна сказаць, што яна дае ацэнку жыццёвай пазіцыі чалавека. Пры гэтым заўважым: чалавека маладога, якому хочацца мець для сябе і для сям'і больш вольнага часу... Але, відаць, спрацоўваюць у такія мінуты хлебаробскі гонар, пачуццё абавязку, якія ставяць яго на правы фланг працоўнага саперніцтва.

Перадавік, лічыць Сяргей, не той, хто дбае толькі пра свой працоўны поспех. Калі не дапамог таварышу, трактар якога «засеў» у каляіне, калі раўнадушна глядзіш на суседа-механізатара, што з-за ленасці або няўмення не выконвае норму, – значыць, не дарос ты яшчэ да

гонару называцца перадавіком. Сам Сяргей – чулы, таварыскі, карыстаецца ўсеагульнай павагай у калектыве механізатараў, хоць ён яшчэ і малады, але многія навічкі могуць ужо смела назваць яго сваім настаўнікам. Асабістым прыкладам, перакананнямі прывівае ён любоў да зямлі бацькоў маладым таварышам.

Слова яго важкае, аўтарытэтнае. А гэта так важна сёння. Бо што і казаць, цяжка цяпер працаваць на зямлі. Але Сяргей не здаецца, ды яшчэ і іншых не забывае падбадзёрыць:

– Трэба пацярпець, хлопцы, – гаворыць ён. – Закончыцца ж калі-небудзь гэта неўладкаванасць, наступяць лепшыя часы. Толькі мы – кожны на сваім месцы – павінны набліжаць іх сваей працай.

Правы механізатар. Нягожа раскісаць. Ці такія мы ўжо нягеглыя, што не справімся суполкай з тым, што даводзіцца перажываць? Абавязкова справімся! Разам з такімі, як Сяргей Лугоўскі.

**Мікола Мацієўскі**